***Мурашка Н. У.**, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы № 196 г. Мінска, магістрант БДПУ;*
***Шылава А. С.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій факультэта кіравання і прафесійнага развіцця Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ*

# Выхаванне і навучанне малодшых школьнікаў сродкамі фальклору на прыкладзе восеньскіх народных святаў

Праблема выхавання і навучання малодшых школьнікаў выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці, а таксама фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў.

The problem of upbringing and education of children is a necessity of search and introduction of new approaches that facilitate effective learning and ensure the achievement of predesigned outcomes based on the interaction of stakeholders and the creation of learning activities in elementary school.

***Ключавыя словы:*** фальклор, фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, восеньскія традыцыйныя святы.

***Keywords:*** folklore, formation of speech and communication competence, Belarusian autumn traditions.

Фальклор з'яўляецца дзейсным метадам гуманізацыі выхавання з першых гадоў жыцця, таму што змяшчае мноства метадаў педагагічнага ўздзеяння на дзяцей з улікам іх узроставых магчымасцей. Зварот да фальклору і да народных традыцый на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі спрыяе выхаванню ў малодшых школьнікаў павагі да сваіх нацыянальных вытокаў. У фальклоры тысячагадовым народным педагагічным вопытам адабраны самыя натуральныя і неабходныя формы развіцця маўлення, музычных і паэтычных здольнасцей, лагічнага і вобразнага мыслення, кемлівасці, гумару, сатыры, працоўных і фізічных навыкаў.

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» для IV класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання ў раздзеле «Геаграфічныя і гістарычныя звесткі аб нашай Раздзіме» прадугледжвае азнаямленне вучняў з традыцыйнымі народнымі святамі, такімі як Радаўніца, Купалле, Дзяды, Каляды [1, с. 115]. Мы прапануем азнаямленне з гэтымі святамі ў папярэдніх класах у пазавучэбнай дзейнасці з мэтамі:

а) апераджальнага навучання па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»;

б) фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў межах міжпрадметных сувязей паміж вучэбнымі прадметамі «Беларуская мова», «Літаратурнае чытанне» і «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь»;

в) этнакультурнага выхавання праз выкарыстанне дыдактычнага прынцыпу выхавання і навучання ў дзейнасці.

У папярэдніх артыкулах мы разглядалі фальклор у якасці сродку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, а таксама этнакультурнага выхавання ў малодшым школьным узросце на прыкладзе традыцыйных народных святаў Каляды [2], Радаўніца [3] і Купалле [4] і расказвалі пра распрацаваную намі сістэму фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз вывучэнне фальклорных традыцый у пазавучэбнай дзейнасці [3]. У гэтым артыкуле мы разгледзім выкарыстанне сістэмы выхавання і навучання малодшых школьнікаў сродкамі фальклору на прыкладзе цыкла восеньскіх традыцыйных народных святаў, адным з якіх з'яўляюцца Дзяды.

У сувязі з тым, што Дзяды — гэта дастакова складанае традыцыйнае свята для ўспрымання і разумення малодшымі школьнікамі, то мы лічым, што мэтазгодна абмежавацца знаёмствам з ім

у кантэксце цыкла восеньскіх традыцыйных народных святаў.

**Этап знаёмства** па тэме ***«Восеньскія народныя святы»*** найлепш правесці ў III класе ў час тэматычнай класнай гадзіны.

**Тэматычная класная гадзіна**
**«Восеньскія народныя святы»**

***Мэта:*** пазнаёміць вучняў з восеньскімі традыцыйнымі народнымі святамі.

***Задачы:***

- пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- ствараць умовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя «Восеньскія народныя святы»; карткі з назвамі святаў (Багач, Узвіжанне, Пакровы, Дзяды); буклет.

**1. Арганізацыйны этап. Падрыхтоўка вучняў да ўспрымання матэрыялу.**

***Настаўнік (Н.):*** Павітаемся з вамі на беларускай мове: «Добры дзень добрым людзям!»

***Вучні (разам):*** Наша Вам прывітанне!

***Н.:*** Як вы ўжо здагадаліся, паколькі вітаемся мы з вамі на беларускай мове, то і гаварыць мы будзем аб Беларусі, беларусах ды іх традыцыях. Сёння мы працягнем знаёмства з традыцыйнымі народнымі святамі. Пра некаторыя з іх мы ўжо ведаем вельмі шмат, таму давайце ўспомнім, пра якія святы мы з вамі гаварылі і ў які час года яны святкуюцца.

***Вучань (В.):*** Мы гаварылі пра Каляды. Іх святкуюць зімой.

***Н.:*** Малайцы! Яшчэ якія святы ўспомніце?

***В. 1:*** Купалле!

***Н.:*** Добра, але зрабі свой адказ поўным, калі ласка.

Важным для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца тое, што настаўнік заўсёды павінен дабівацца ад сваіх вучняў поўных адказаў на пытанні.

***В. 1:*** Мы ведаем Купалле! Купалле святкуюць летам.

***В. 2:*** А яшчэ ёсць Вялікдзень! Яго святкуюць вясной.

***Н.:*** Цудоўна! Мы ўспомнілі святы зімовыя, веснавыя, летнія, і сёння я хачу вас пазнаёміць з восеньскімі святамі. Можа, хто з вас ведае якія-небудзь з іх?

***В.:*** Я ведаю Дажынкі!

***Н.:*** Так, але я крыху раскажу пра гэта! Сапраўды, у апошні час Дажынкі святкуюць восенню, але так было не заўсёды. Да гэтага Дажынкі святкавалі летам, пасля таго як былі зжатыя ўсе злакававыя: пшаніца, жыта, ячмень. Гэта адбывалася прыкладна ў жніўні. Сёння пад Дажынкамі разумеюць свята збору ўраджаю, аднак паколькі мы гаворым пра традыцыйныя восеньскія святы, то пра сучасныя Дажынкі сёння мы не будзем весці размову.

**2. Знаёмства вучняў з восеньскімі народнымі святамі.**

Расповед настаўніка з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі.

На Беларусі да восеньскіх святаў прынята адносіць Багач, Узвіжанне, Пакровы і Дзяды.

Першым быў **Багач**, які святкавалі 21 верасня. Гэта старадаўняе свята заканчэння збору ўраджаю. У народзе казалі, што ў гэты час у кожнага селяніна ўсяго багата. Гаспадар падлічвае свае скарбы, сабраныя з поля і гарода. А яшчэ Багач — «таму што восень багатая на дары, якія ёй даў сам Бог» [5, с. 156].

Багачом беларусы называлі і царкоўнае хрысціянскае свята Раства Багародзіцы, ці Другой Пачыстай.

Галоўная роля ў час святкавання належала «багачу» — лубку жыта са свечкай, устаўленай у яго. Зерне ў кошык збіралі з першага снапа, свечку рыхтавалі пад спеў песен. Згодна з павер'ем, «Багач» забяспечваў сям'і дабрабыт і шчасце [6, с. 57]. На працягу года «багач» стаяў у хаце каго-небудзь з вяскоўцаў пад абразамі. На гэта свята пачыналася сяўба азімых. Казалі: «Прышоў Багач — закідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку». З гэтага часу пачыналася пара сватанняў і вяселляў, ладзіліся кірмашы.

Услед за Багачом святкавалі **Узвіжанне** — 27 верасня. Хрысціяне адзначаюць яго у гонар узвіжання Крыжа Гасподняга для ўшанавання яго вернікамі. У народзе гэта свята ўспрымалася як усеагульны зрух, здвіг і паварот на зіму: «Зямля з лета на зіму зварухнулася».

Узвіжанне было днём руху ў вырай птушак. Апрача адлёту птушак, у прыродзе існавала яшчэ адно «здвіжанне» — гадзюк, таму ў гэты дзень не хадзілі ў лес. Лічылі, што «там нібы збіраліся ў клубкі гадзюкі і вужы, каб схавацца ў норы на зіму» [6, с. 59]. Існуе легенда, згодна з якой у цара гадзюк на галаве ёсць карона ў выглядзе залатых рожак. Лічылася, што калі ўдарыць па ім дубцом, схапіць рожкі і ўцячы, то такая карона здымае ўсе замкі і засаўкі.

14 кастрычніка святкавалі **Пакровы**. Царкоўнае свята, згодна з якім Маці Божая раскінула над веруючымі свой амафор (белае пакрывала, якое насілі жанчыны на плячах ці галаве), абараняючы іх ад нягод.

У народзе Пакровы чакалі з нецярпеннем, бо тады станавілася менш работы. Свята ўспрымалі як своеасаблівую мяжу паміж восенню і зімой, бо яны лічыліся апошнім днём збору пладоў і грыбоў. Свята не адзначалі асаблівымі абрадамі. У гэты дзень людзі прасілі заступніцтва і дапамогі ў Царыцы Нябеснай [5, 166].

Сёння ў нас у гэты дзень адзначаюць Дзень маці з той нагоды, што і нашы маці абараняюць ад нягод сваіх дзяцей усё жыццё [6, с. 61].

Закрывалі цыкл восеньскіх святаў **Дзяды**, якія і па сённяшні дзень святкуюцца ў суботу перад 8 лістападам — Змітравым днём.

Дзяды — гэта свята народнага календара, звязанае з памінаннем продкаў, якіх старажытныя беларусы называлі дзядамі. Дзяды адзначалі некалькі разоў на год, аднак галоўнымі былі восеньскія. Нашы продкі верылі, што ў гэтыя дні душы памерлых ідуць на памінальную вячэру ў хату да сваіх нашчадкаў. Таму на святочны стол ставілі «дзедаўскі» посуд, куды кожны адліваў напоі і адкладваў ежу. Звычайна на стале была і спецыяльная памінальная страва — куцця. Продкаў трэба было добра пачаставаць, каб тыя не пакрыўдзіліся і не наслалі неўраджай і няшчасці на сваякоў.

***Н.:*** Вы так уважліва слухалі мяне, а цяпер адкажыце на маё пытанне: пра якія восеньскія народныя святы вы даведаліся?

***В. 1:*** Мы даведаліся пра Дзяды і Узвіжанне.

***В. 2:*** А яшчэ Вы нам расказалі пра Багач і Пакровы.

***Н.:*** Якія святы вас зацікавілі і чаму?

***В. 1:*** Мне спадабаліся Пакровы, таму што я цяпер ведаю, чаму ў гэты дзень мы адзначаем Дзень маці.

***В. 2:*** А мяне зацікавіла Узвіжанне, таму што там цікавая легенда пра гадзюк.

***Н.:*** Добра! Увогуле беларускія восеньскія святы вельмі цікавыя. Кожнае з іх мае свой сэнс і сваё прызначэнне. А цяпер паглядзім, што вы запомнілі з майго расказа.

**Праца ў групах.**

***Н.:*** Зараз кожны з вас падрыхтуе пра адно са святаў невялікае вуснае апавяданне. Для гэтага мы дзелімся на групы па чатыры чалавекі, што вы ўжо добра ўмееце рабіць. Кожнай групе я раздам па чатыры карткі з назвамі святаў. Карткі мы пакладзём літарамі ўніз і перамяшаем, затым кожны ўдзельнік групы выцягне для сябе адну з картак і падрыхтуе апавяданне пра гэтае свята.

Сваё апавяданне вы складаеце па наступнай схеме:

- як называецца свята;
- калі яго адзначалі;
- чым свята адрозніваецца ад іншых.

Настаўнік раздае карткі з назвамі святаў.

***Н.:*** Цягніце карткі. (Вучні выцягваюць.) Добра! Пачынайце працу, на выкананне задання ў вас 5 хвілін.

Вучні самастойна працуюць.

***Н.:*** Цяпер працуем у групах. Кожны расказвае ў групе сваё апавяданне, першым пачынае той, хто складаў расказ пра свята Багач, затым — пра Узвіжанне, Пакровы і Дзяды. Адзін вучань расказвае — астатнія слухаюць. Калі вы пачуеце памылкі, напрыклад, выкарыстана рускае слова або словы, ужытыя няправільна, то можаце ціха і спакойна паправіць вашага сябра.

Вучні працуюць у групах.

Пасля таго як дзеці выканалі заданне, важна паказаць ім на слайдзе правільны варыянт іх адказу, каб вучні маглі сябе ацаніць.

***Н.:*** Усе расказалі? Малайцы! Я прапаную аднаму з тых, хто рыхтаваў паведамленне пра Багач, расказаць усяму класу. Ёсць жадаючыя?

Выбраць вучня можна па жаданні або шляхам жараб'ёўкі.

Вучань выходзіць да дошкі і расказвае тое, што ў яго атрымалася.

***Н.:*** Малайчынка, сядай на сваё месца. Я прапаную вам параўнаць правільны адказ з тым, што ў вас атрымалася, і выправіць памылкі ў адказе.

Настаўнік адкрывае слайд з правільным адказам і просіць таго, хто адказваў, прачытаць напісанае на слайдзе.

***Н.:*** Добра! Цяпер вучні ўсяго класа, якія сядзяць на першым варыянце, чытаюць услых яшчэ раз правільны тэкст з дапамогай слайда, а вучні, якія сядзяць на другім варыянце, правяраюць, ці правільна ён прачытаны. Затым вучні, якія сядзяць на другім варыянце, чытаюць яго, а вучні, якія сядзяць на першым варыянце, правяраюць.

Вельмі важна, каб правільны варыянт адказу чыталі ўслых **усе** вучні класа. Такім чынам кожны з іх некалькі разоў за ўрок чытае і вымаўляе граматычна правільна пабудаваныя сказы, вучыцца фармуляваць вусныя выказванні і лепш запамінае матэрыял.

***Н.:*** Зараз паслухаем вуснае паведамленне пра Узвіжанне. Хто хоча расказаць?

Па аналогіі праходзіць праца з астатнімі святамі.

**3. Падвядзенне вынікаў.**

***Н.:*** Пра якія народныя святы мы сёння вялі размову?

***В. 1:*** Сёння мы вялі размову пра восеньскія народныя святы.

***В. 2:*** Мы гаварылі пра Багач, Дзяды, Узвіжанне і Пакровы.

***Н.:*** Каб вы запомнілі пра тое, аб чым мы з вамі гаварылі, і змаглі расказаць сваім бацькам і сябрам, я падрыхтавала для вас буклет на памяць.

Буклет з'яўляецца алгарытмам усёй атрыманай на класнай гадзіне інфармацыі ў сціснутым выглядзе, якую кожны вучань забірае з сабой дадому.

**4. Рэфлексія.**

Настаўнік прапануе дзецям адказаць на наступныя пытанні:

***Н.:*** Пра што новае вы сёння даведаліся?

***Н.:*** Пра што вы раскажаце сваім бацькам?

Наступны **этап распаведу** па тэме ***«Восеньскія народныя святы»*** мэтазгодна правесці праз год у IV класе таксама ў час тэматычнай класнай гадзіны ў лістападзе. За тыдзень да плануемай даты правядзення жадаючым паўдзельнічаць трэба раздаць тэксты для падрыхтоўкі пераказу:

1. На Беларусі да восеньскіх святаў прынята адносіць Багач, Уздвіжанне, Пакровы і Дзяды.

2. **Багач** святкавалі 21 верасня. Гэта старадаўняе свята заканчэння збору ўраджаю. У народзе казалі, што ў гэты час у кожнага селяніна ўсяго багата.

3. Галоўная роля ў час святкавання належала «багачу» — лубку жыта са свечкай, устаўленай у яго. Зерне ў кошык збіралі з першага снапа, свечку

рыхтавалі пад спеў песен. «Багач» забяспечваў сям'і дабрабыт і шчасце.

4. На працягу года «багач» стаяў у хаце каго-небудзь з вяскоўцаў пад абразамі. З гэтага часу пачыналася пара сватанняў і вяселляў, ладзіліся кірмашы.

5. 27 верасня святкавалі **Узвіжанне**. У народзе гэта свята ўспрымалася як усеагульны зрух, здвіг і паварот на зіму: «Зямля з лета на зіму зварухнулася».

6. Узвіжанне было днём руху ў вырай птушак. У прыродзе існавала яшчэ адно «здвіжанне», калі гадзюкі і вужы нібы збіраліся ў клубкі, каб схавацца ў норы на зіму. Таму ў гэты дзень не хадзілі ў лес.

7. 14 кастрычніка святкавалі **Пакровы**. Царкоўнае свята, згодна з якім Маці Божая раскінула над веруючымі белае пакрывала, абараняючы іх ад нягод.

8. Пакроў лічыўся і апошнім днём збору пладоў і грыбоў, таму свята ўспрымалі як своеасаблівую мяжу паміж восенню і зімой. Свята не адзначалі абрадамі, а проста прасілі ў Маці Божай заступніцтва і дапамогі.

9. Сёння ў нас у гэты дзень адзначаюць Дзень маці з той нагоды, што і нашы маці абараняюць ад нягод сваіх дзяцей усё жыццё.

10. Закрывалі цыкл восеньскіх святаў **Дзяды**, якія і па сённяшні дзень святкуюцца ў суботу перад 8 лістападам — Змітравым днём.

11. Дзяды — гэта свята народнага календара, звязанае з памінаннем продкаў, якіх старажытныя беларусы называлі дзядамі.

12. Нашы продкі верылі, што ў гэтыя дні душы памерлых ідуць на памінальную вячэру ў хату да сваіх нашчадкаў. Таму на святочны стол ставілі «дзедаўскі» посуд, куды кожны адліваў напоі і адкладваў ежу.

13. Продкаў трэба было добра пачаставаць, каб тыя не пакрыўдзіліся і не наслалі неўраджай і няшчасці на сваякоў.

## Тэматычная класная гадзіна «Традыцыйныя святы восені»

***Мэта:*** паглыбленне ведаў аб традыцыйных святах Багач і Дзяды.

***Задачы:***

- пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- ствараць умовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя «Традыцыйныя святы восені»; тэкст для чытання і раздатачны матэрыял для групавой працы — красворд; буклет.

**1. Арганізацыйны этап. Падрыхтоўка вучняў да ўспрымання матэрыялу.**

***Н.:*** Давайце ўспомнім, якія народныя святы адзначалі старажытныя беларусы восенню.

***В. 1:*** Беларусы адзначалі Багач, Пакровы.

***В. 2:*** А яшчэ старажытныя беларусы адзначалі Дзяды і Узвіжанне.

***Н.:*** Малайцы! Давайце ўзгадаем, як іх святкавалі старажытныя беларусы, а дапамогуць нам у гэтым вучні, якія падрыхтавалі дома расказ пра іх.

Расказ вучняў суправаджаецца паказам мультымедыйнай прэзентацыі.

**2. Паглыбленне ведаў пра Багач і Дзяды.**

***Н.:*** Выдатны расказ! Вы добра падрыхтаваліся. Малайцы!

***Н. (зварот да класа):*** Ці спадабалася вам?

***В.:*** Так, нам спадабалася!

***Н.:*** Вы ўспомнілі, што ўвосень беларусы адзначалі Багач, Узвіжанне, Пакровы і Дзяды, але традыцыйнымі з іх лічацца толькі два. А як вы разумееце слова «традыцыйныя»?

***В.:*** Я так думаю, што традыцыйныя — гэта калі ёсць нейкая традыцыя.

***Н.:*** Малайчына! Ты маеш рацыю. Традыцыйным называецца тое свята, якое прадугледжвае наяўнасць якой-небудзь традыцыі. З гэтага пункту гледжання традыцыйнымі з восеньскіх святаў лічацца Багач і Дзяды. Я крыху вам расказвала пра традыцыі святкавання Багача. Хто можа ўспомніць, што гэта за традыцыі?

***В.:*** Там збіралі зерне ў кошык з першага снапа, свечку рыхтавалі пад спеў песен.

***Н.:*** Сапраўды так. Галоўнай дзеяй свята было ссыпанне агульнага «багача». Усе ўдзельнікі прыносілі з сабой па жменьцы зерня жыта і ссыпалі ў агульны лубок у хаце каго-небудзь з вяскоўцаў. Потым у лубок ставілі свечку пад спевы і абавязкова запрашалі свяшчэнніка. Гаспадар той хаты, дзе адбывалася дзейства, ідучы ўслед за святаром, нёс «багач» у наступны двор, дзе іх сустракалі тамашнія гаспадары. На іх двары быў падрыхтаваны для святочнай сустрэчы стол, накрыты белым абрусам і застаўлены лубкамі жыта, пшаніцы, ячменю. Святар служыў кароткі малебен, пасля якога ўсіх удзельнікаў абраду запрашалі ў хату для частавання. Так удзельнікі абраду абыходзілі па чарзе ўсе хаты. Хто ўспомніць прыказку пра Багач?

***В.:*** Прышоў Багач — закідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку!

***Н.:*** Малайчынка! А якое было другое традыцыйная свята?

***В. (разам усе):*** Дзяды!

***Н.:*** Як добра ўсё памятаеце! Хто можа мне сказаць, чаму Дзяды лічацца традыцыйным святам?

***В.:*** Я думаю, што там таксама ёсць якая-небудзь традыцыя.

***Н.:*** Сапраўды, традыцыі ёсць. На Дзяды беларусы ўспаміналі сваіх продкаў. З раніцы яны хадзілі ў царкву на памінальную службу і неслі туды на асвячэннне стравы — куццю, мёд, цукеркі. Хто скажа, што такое куцця?

***В.:*** Куцця — гэта ячневая каша.

***Н.:*** Так! У гэты святочны дзень галоўнай была вячэра ў памяць дзядоў. Хто такія дзяды?

***В.:*** Дзядамі беларусы называлі сваіх продкаў.

***Н.:*** Правільна. Дзяды — гэта продкі, тыя людзі, каго с намі больш няма. Перад тым, як сесці вячэраць, вешалі ля дзвярэй ручнік і адсоўвалі заслонку

ў коміне. Для вячэры на Дзяды людзі не шкадавалі прыпасаў, бо дзядоў трэбы было добра «пачаставаць». Гаспадар тры разы абыходзіў стол і называў па імёнах продкаў, быццам запрашаючы іх на вячэру. Пакуль сядзелі за сталом, заслонку ў коміне не засоўвалі, не карысталіся нажом, не трымалі лыжку доўга ў руках. Удзельнікі трапезы аддавалі даніну павагі сваім продкам і гаварылі толькі пра іх лепшыя рысы, добрыя ўчынкі, каб тыя не пакрыўдзіліся. У некаторых мясцінах іх яшчэ і весялілі: спявалі песні, скакалі (танцавалі). Успомніце, чаму людзі так баяліся пакрыўдзіць дзядоў.

***В.:*** Таму што людзі верылі, што калі дзяды пакрыўдзяцца, то могуць наслаць на іх неўраджай і няшчасці.

***Н.:*** Малайцы! Вы так многа ведаеце, што я прапаную вам пабыць сапраўднымі навукоўцамі. Справа ў тым, што слова *дзед* у старажытных беларусаў мела некалькі сэнсаў. Я прапаную вам самастойна вызначыць усе значэнні гэтага слова. Каб у нас усё атрымалася, мы будзем працаваць у парах.

***Праца ў парах.***

**Этап 1:** для працы ў парах кожны вучань атрымлівае спецыяльны тэкст (раздатачны матэрыял для парнай працы па тэме «Традыцыйныя святы восені»), які ён павінен будзе прачытаць і знайсці ў ім усе значэнні слова *дзед*.

*З простым словам «дзед» звязана вельмі шмат у беларускай культуры. «Дзедам» называлі першы зажынкавы сноп, які клалі за абразы, бо лічылі яго апекуном збожжа і хатніх спраў.*

*Яшчэ «дзедам» называлі важныя рэчы селяніна: цэнтральны пячны слуп жытла, прыстасаванне для лучыны ў хаце, «шышачкі» лапуху, якія выкарыстоўвалі як абярэгі. «Дзядамі» называлі саміх продкаў, абрад іх памінання, свята памінання і стравы. У старажытнасці «дзядамі» называлі жабрака, нячысціка і часам нават хмары на небе. Галоўнае, што іх аб'ядноўвала, — гэта сувязь са светам памерлых [5, с. 173].*

***Н.:*** Для працы вам спатрэбіцца аловак. Спачатку мы працуем самастойна. Кожнаму з вас я раздам тэкст. Вы павінны яго прачытаць і знайсці значэнні слова *дзед*. Калі вы знаходзіце новае значэнне, то можна яго падкрэсліць алоўкам. Калі ласка, не падглядайце ў суседа, выконвайце самастойна, так будзе больш цікава. На гэта заданне ў вас 5 хвілін. Хто выканае раней, той пераварочвае ліст зваротным бокам уверх і кладзе на яго аловак. Усё зразумела?

***В. (разам):*** Так!

***Н.:*** Калі ўсё зразумела, пачынаем працу.

На выкананне задання дзецям адводзіцца каля 5 хвілін.

**Этап 2:** вучні павінны палічыць, колькі значэнняў слова *дзед* яны знайшлі, і запісаць гэтую лічбу над тэкстам.

***Н.:*** Я бачу, што ўсе выканалі заданне. Малайцы! Цяпер пераварочваем свой ліст і лічым, колькі значэнняў вы знайшлі. (Вучні лічаць.)

***Н.:*** Запішыце лічбай над тэкстам, колькі значэнняў у вас атрымалася. Пасля параўнайце сваю лічбу з лічбай свайго суседа па парце.

**Этап 3:** вучні працуюць у парах і правяраюць выкананне задання ў сваіх суседзяў па парце.

***Н.:*** Зараз мы бяром ручку, мяняемся сваімі тэкстамі і яшчэ раз чытаем. Калі ваш сябар, на вашу думку, прапусціў нейкае значэнне, то трэба паказаць гэта яму і сказаць, чаму вы лічыце, што дадзенае слова неабходна падкрэсліць. Вы абмяркоўваеце і вырашаеце, што рабіць. Калі ўсё ж такі трэба падкрэсліць, то падкрэсліваеце ручкай. Тое ж самае мы робім, калі бачым, што падкрэслена лішняе значэнне. Толькі ў гэтым выпадку пасля абмеркавання трэба закрэсліць падкрэсліванне. Пасля праверкі зноў лічыце ўсе значэнні і зверху пішыце новую лічбу ўжо ручкай. Калі ўсё зразумела, то пачынаем працу. У вас ёсць 5 хвілін.

**3. Прадстаўленне вынікаў парнай працы.**

Калі праца скончана, настаўнік шляхам франтальнай праверкі вызначае, якая з пар дапусціла памылкі. Ажыццяўляецца гэта наступным чынам: спачатку настаўнік просіць падняць рукі тых вучняў, у каго атрымалася 13 значэнняў, затым 12, 11, 10, 9 і г. д. Правільным будзе адказ тых вучняў, у якіх атрымалася **11 значэнняў**.

Пасля гэтага настаўнік адкрывае слайд з правільным адказам і просіць параўнаць яго з тым, што зрабілі дзеці. Па кожнай неадпаведнасці настаўніку неабходна даць тлумачэнне.

***Н.:*** Цяпер праверце, калі ласка, маю працу. Калі вы лічыце, што я дзе-небудзь памылілася, то выкажыце мне свае меркаванні.

***В.:*** Мы лічым, што ў вас памылка ў другім сказе: *«Дзедам» называлі першы зажынкавы сноп, які клалі за абразы, бо лічылі яго апекуном збожжа і хатніх спраў.* Тут трэба яшчэ падкрэсліць слова «апекуном».

***Н.:*** Не, я з вамі не пагаджуся. Давайце паглядзім. (Настаўнік чытае сказ услых.) «Дзедам» называлі сноп, які быў апекуном збожжа. Гэта сноп быў апекуном. А ўжо сноп, у сваю чаргу, называлі «дзедам». Дзякуй за тое, што вы не пабаяліся выказацца. Малайцы!

***В.:*** А чаму вы падкрэслілі слова *абрад*?

***Н. (чытае спрэчны сказ):*** Таму што, па-першае, «дзяды» — гэта продкі, па-другое, так называецца абрад памінання і, па-трэцяе, таксама называецца само свята памінання. Дзякую за пытанне. Яшчэ ёсць пытанні? Няма. Вось бачыце, як цяжка быць навукоўцам. А каб больш у нас не было сумненняў, давайце прачытаем яшчэ раз услых гэты тэкст. Спачатку вучні, якія сядзяць на першым варыянце, чытаюць услых, а вучні, якія сядзяць на другім варыянце, сочаць за чытаннем і выпраўляюць памылкі. Потым мяняецеся ролямі.

Вучні чытаюць.

**4. Падвядзенне вынікаў.**

***Н.:*** Пра што мы сёння вялі размову?

***В.:*** Сёння мы гаварылі пра традыцыйныя восеньскія святы Багач і Дзяды.

***Н.:*** Малайцы! Якія святы мы называем традыцыйнымі?

***В.:*** Традыцыйнымі называюцца святы з нейкімі традыцыямі.

***Н.:*** Добра! Зараз я прапаную вам разгадаць красворд. Яго будзем разгадваць групамі па чатыры чалавекі. Я вам даю красворд, вы разгадваеце, а потым правяраем. У вас 5 хвілін.

Вучні самастойна разгадваюць красворд.

1. Якое слова для беларусаў мела шмат значэнняў?
2. Якое свята адзначалі 27 верасня?
3. Пакровы — гэта своеасаблівая ... паміж восенню і зімой.
4. Багач — гэта свята ... .
5. Якое свята адзначалі 14 кастрычніка?

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 | **Д** | З | Е | Д | | | | |
| | | | | | 2 | У | **З** | В | І | Ж | А | Н | Н | Е |
| | | | | | 3 | М | **Я** | Ж | А | | | | | |
| | | | 4 | У | Р | А | **Д** | Ж | А | Ю | | | | |
| 5 | П | А | К | Р | О | В | **Ы** | | | | | | | |

***Н.:*** Красворд разгаданы. Якое галоўнае слова ў нас атрымалася?

***В.:*** Дзяды.

***Н.:*** Малайцы! Правяраем!

Настаўнік паказвае слайд з разгаданым красвордам.

***Н.:*** Вы сёння вельмі добра папрацавалі і па традыцыі я падрыхтавала для вас на памяць буклет.

**5. Рэфлексія.**

Настаўнік прапануе дзецям адказаць на пытанне:

— Што вам спадабалася на класнай гадзіне больш за ўсё?

***В.:*** Мне спадабалася быць навукоўцам.

***В.:*** А мне спадабалася разгадваць красворд.

Такім чынам, на прыкладзе восеньскіх народных святаў мы паказалі сістэму працы з фальклорным матэрыялам.

Такая сістэма працы спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай і сацыяльна-культурнай кампетэнцый, таму што:

- дапамагае авалоданню рознымі відамі маўленчай дзейнасці;
- фарміруе маўленчыя паводзіны;
- развівае ўменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем;
- з'яўляецца сродкам засваення культурных традыцый;
- выхоўвае паважлівае стаўленне да культуры і мовы беларускага і іншых народаў;
- спрыяе назапашванню агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

**Спіс выкарастаных крыніц**


1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 4 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 203 с.
2. *Шылава, А. С.* Фальклор як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці / А. С. Шылава, Н. У. Мурашка // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2019. — № 11. — С. 59–65.
3. *Мурашка, Н. У.* Народныя традыцыі як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 3. — С. 54–61.
4. *Мурашка, Н. У.* Выхаванне і навучанне фальклорам на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў сучаснай школе на прыкладзе традыцыйнага свята «Купалле» / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 5. — С. 47–55.
5. Беларускія народныя святы для дзяцей / склад. А. Коршак ; маст. Л. Галубец. — Мінск : Беларусь, 2019. — 176 с. : іл.
6. *Лозка, А. Ю.* Святы Беларусі / А. Ю. Лозка. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. — 72 с. : іл. — (Беларуская дзіцячая энцыклапедыя).